# Гісторыя

Л.В. МІКАЛАЕВА

## РОЛЯ РЭЛІГІЙНАГА ФАКТАРУ Ў АЖЫЦЦЯЎЛЕННІ ЗНЕШНЯЙ ПАЛІТЫКІ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА Ў КАНЦЫ XV – ПАЧАТКУ XVI ст.

Рассматривается влияние религии на внешнюю политику Великого княжества Литовского в конце XV – начале XVI в. Делается вывод, что именно в этот период во внешней политике падает роль православного и определяющим становится католический религиозный фактор на эту сферу. В свою очередь, это предопределило вхождение ВКЛ в европейскую католическую династическую систему.

The article shows the influence of the religious factor on the foreign policy of the Grand Duchy of Lithuania at the end of XV – the beginning of XVI centuries. It makes the conclusion that namely at this period the role of the orthodox factor in foreign policy is decreasing and the influence of the catholic religious factor is getting more important. In its turn it has predetermined the occurrence of the Grand Duchy of Lithuania in the European catholic dynastic system.

Як у любой поліэтнічнай і поліканфесійнай краіне, дзе прадстаўнікі вядучых этнасаў, прэтэндуючыя на пануючае становішча ў дзяржаве, з’яўляліся прыхільнікамі розных канфесій хрысціянскай царквы, у Вялікім княстве Літоўскім (ВКЛ) рэлігійны фактар аказваў значны ўплыў на ўсе бакі палітычнага жыцця грамадства і дзяржавы, у тым ліку і на яе знешнюю палітыку. Апошняя ахоплівае дзейнасць дзяржавы на міжнароднай арэне, рэгулюе яе адносіны з іншымі суб’ектамі знешнепалітычнай дзейнасці. У познім Сярэднявеччы – пачатку Новага часу імі былі толькі дзяржавы. Надзвычай выразна ўздзеянне рэлігійнага чынніка на гэту сферу праявілася ў канцы XV – пачатку XVI ст., асабліва на тым фоне, якім з’яўлялася знешнепалітычнае становішча ВКЛ, што аказалася ўцягнутым у адзін з тагачасных вузлоў міжнародных супярэчнасцей.

Сутнасць яго заключалася ў даўніх спрэчках паміж ВКЛ і Вялікім княствам Маскоўскім вакол праблемы так званай «спадчыны Рурыкавічаў», ці «рускіх» зямель. Кожная з дзяржаў прад’яўляла свае правы на гэтыя абшары[1]. У канцы XV ст. іх супрацьстаянне вылілася ў першую маскоўска-ліцвінскую вайну 1492–1494 гг., якая паклала пачатак цэлай серыі падобных ваенных канфліктаў. На працягу 1492–1537 гг. адбылося пяць такіх войнаў, прычым толькі адна была ініцыіравана ліцвінскім бокам. Ініцыятар большасці канфліктаў, Маскоўская дзяржава абгрунтоўвала свае экспансіяніcцкія памкненні дынастычным правам на ўсходнія землі ВКЛ. На кожнае патрабаванне вярнуць захопленыя тэрыторыі маскоўскія ўладары адказвалі, што трымаюць толькі «сваю вотчыну», а пазней растлумачылі, што «Русская земля вся, съ божьею волею, изъ старины, отъ нашихъ прародителей наша отчина», а вотчына літоўскіх вялікіх князёў «Лятская земля да Литовская»[2]. Тым самым Маскоўская дзяржава давала вычарпальную фармулёўку сваёй далейшай знешнепалітычнай праграмы.

Аднак перад пачаткам другой маскоўска-ліцвінскай вайны (1500–1503 гг.) загучалі і новыя прэтэнзіі. Каб неяк апраўдаць парушэнне мірнага дагавору 1494 г., які фіксаваў «вечны» мір, а таксама абгрунтаваць свае агрэсіўныя захады, маскоўскі вялікі князь Іван III аб’явіў сябе «абаронцам» праваслаўнага насельніцтва ВКЛ, якое быццам бы «пакутавала» ад уціску каталіцкай царквы[3]. Тым самым маскоўскі бок, выступаючы зачынальнікам новага ваеннага канфлікту, падкрэсліваў вырашальнае значэнне рэлігійнага фактару для пачатку гэтай знешнепалітычнай акцыі, якая набыла, такім чынам, і ідэалагічную афарбоўку. Саюз маскоўскіх вялікіх князёў і праваслаўнай царквы, які склаўся яшчэ з часоў удзельнай сістэмы, прычыніўся да таго, што палітычная ідэалогія Маскоўскай дзяржавы была царкоўнай[4], а маскоўскія вялікія князі ўспрымаліся ў ёй не столькі як нацыянальныя ўладары, колькі як уладары праваслаўнага хрысціянства. Гэтым падмацоўвалася і ўяўленне аб спадчынных правах маскоўскіх уладароў на землі, населеныя праваслаўнымі, у тым ліку і на частку зямель ВКЛ. А вялікія князі літоўскія, якія валодалі імі, разглядаліся не толькі як палітычныя, але і як ідэйныя праціўнікі. Гэта сітуацыя служыла яскравым прыкладам таго, як свецкая ўлада маскоўскіх вялікіх князёў, заключыўшы саюз з уладай духоўнай, імкнулася выкарыстоўваць рэлігійныя пачуцці людзей для ўмацавання сваіх пазіцый.

Вяртаючыся да пытання аб правамоцнасці выкарыстання рэлігійнай матывацыі для пачатку ваеннага канфлікту, трэба адзначыць, што рэлігійныя ганенні на праваслаўных, відавочна, не з'яўляліся сапраўднай прычынай вайны[5], для гэтага не было падстаў: хаця праваслаўе з'яўлялася тут не пануючай, а толькі цярпімай рэлігіяй, цярпімасць гэта была дастаткова шырокай. Ніякага гвалту і рэпрэсій супраць праваслаўных у ВКЛ не назіралася, а ў пытаннях культу ім давалася поўная свабода. Наадварот, у канцы XV ст. выразна праявілася імкненне ліцвінскіх дзяржаўных улад да ўнутранага ўмацавання пазіцый праваслаўнай царквы.

Прыкладам добразычлівага іх стаўлення да яе і найбольш важным актам той эпохі ў гэтым кірунку можна лічыць пацвярджэнне 20 сакавіка 1499 г. вялікім князем літоўскім Аляксандрам Казіміравічам «Скрутка Ярослава» – зборніка кананічнага права, заснаванага на старажытнарускім «Уставе Ярослава» (Мудрага) – і забарону ў сувязі з гэтым усім свецкім асобам (каталіцкім і праваслаўным) умешвацца ў справы праваслаўнай царкоўнай юрысдыкцыі[6]. Гэтым актам мітрапаліт Кіеўскі і ўсяе Русі атрымаў судовы імунітэт ва ўладаннях мітраполіі і ўсіх падпарадкаваных ёй епіскапстваў. Адносна зямельнай уласнасці праваслаўная царква ў ВКЛ была нават у лепшым становішчы, чым у Вялікім княстве Маскоўскім, бо тут была гарантавана недатыкальнасць праваслаўных царкоўных (як і іншых) уладанняў. У Маскве ж у гэты час усё больш мацнелі імкненні да секулярызацыі[7]. Адзіным заканадаўчым абмежаваннем правоў праваслаўных у княстве на той час была прадугледжаная Гарадзельскім прывілеем 1413 г. забарона ўсім некатолікам займаць цэнтральныя пасады ў дзяржаве, што не заўсёды выконвалася[8]. Сцвярджэнне прывілея, што ўсе некатолікі, у асноўным праваслаўныя (а яны складалі большасць насельніцтва княства), не павінны былі дапускацца на дзяржаўныя пасады і засядаць у гаспадарскай Радзе, мела хутчэй ідэалагічны, а не практычны характар, бо большасць мясцовага кіраўніцтва і пэўная частка паноў-рады ў сілу захавання дзеяння прынцыпу «сохранения старины» належалі да праваслаўнай веры. Таму, зразумела, ліцвінскі бок адвяргаў заявы маскоўскіх улад аб уціску на праваслаўных як надуманыя, закліканыя прыхаваць захопніцкія планы ўсходняга суседа. «Отчина наша къ тому ко всему, брате, есть причина», – небеспадстаўна сцвярджалі літоўскія вялікія князі[9]. Няшчырасць маскоўскіх уладароў-«абаронцаў» знаходзіла падмацаванне і ў іншых фактах. Асабліва яскрава пра гэта сведчылі захады вялікага князя маскоўскага Васіля III вакол набыцца трона ВКЛ пасля смерці ў 1506 г. вялікага князя літоўскага Аляксандра. Ён нават даваў гарантыю, што калі паны «учнут опасатца за верою, и государь их в том ни в чем не порушит, как было при короле, а жаловати их хочет и свыше того»[10].

Разам з тым менавіта на гэты перыяд прыпадае актывізацыя дыпламатычных зносін з Рымскай курыяй у сувязі з апошняй у XV ст. спробай увядзення ў ВКЛ царкоўнай уніі праваслаўнай і каталіцкай цэркваў. Для ВКЛ абмеркаванне пытання царкоўнай уніі мела, акрамя рэлігійнага, яшчэ і палітычнае значэнне, бо ў выпадку поспеху гэтых мерапрыемстваў унутраныя сувязі дзяржавы і салідарнасць грамадства, несумненна, узмацніліся б. Да таго ж маскоўскія ўладары страцілі б падставы да ўмяшання ва ўнутраныя справы ВКЛ пад выглядам абароны праваслаўя. Пры гэтым трэба ўспомніць, што само стварэнне ў сярэдзіне XV ст. асобнай ліцвінскай мітраполіі з цэнтрам у Кіеве было самым цесным чынам звязана з праблемай царкоўнай уніі, а таксама са спробамі вялікіх князёў літоўскіх прывесці маскоўскую мітраполію пад свой уплыў шляхам зацвярджэння канстанцінопальскімі патрыярхамі ліцвінскіх мітрапалітаў у годнасці мітрапалітаў усяе Русі. Апошнія павінны былі станавіцца праваднікамі палітыкі вялікіх князёў літоўскіх на землях, размешчаных на Усход ад ВКЛ.

Трэба адзначыць, што пытанне царкоўнай уніі ўжо неаднаразова ўздымалася ў ВКЛ на працягу XV ст., але спробы яе ўвядзення заканчваліся нічым. Усё ж, нягледзячы на папярэднія няўдачы, у канцы XV ст. у ВКЛ зноў пачала праводзіцца палітыка рэлігійнага адзінства ў дзяржаве. У галіне адносін католікаў і праваслаўных планавалася царкоўная унія па прыкладу Фларэнтыйскай уніі 1439 г. Стваральнікам гэтай ідэі, верагодна, быў сам вялікі князь Аляксандр, а галоўнымі рэалізатарамі з'яўляліся велікакняжацкі пісар Іван Сапега і мітрапаліт Кіеўскі і ўсяе Русі Іосіф I (Язэп) Балгарынавіч (Булгарыновіч), сваяк апошняга. Шляхам уніі католікаў і праваслаўных ліцвінская дзяржава жадала пазбавіцца ад узрастаючага ўмяшання вялікага маскоўскага князя ў свае ўнутраныя справы, асабліва ў далікатным пытанні становішча праваслаўных у ВКЛ. Надзвычай раздражняльнымі для Вільні былі ў гэты час патрабаванні Івана III адносна пабудовы царквы ў віленскім замку для сваёй дачкі, вялікай княгіні літоўскай Алены, а таксама скаргі на прымушэнне яе да пераходу ў каталіцтва. У такіх умовах у 1500 г. мітрапаліт Кіеўскі і ўсяе Русі Іосіф I Балгарынавіч ажыццявіў чарговую спробу правядзення ў жыццё царкоўнай уніі, пасля чаго імкненні да яе ў княстве ўвогуле зніклі да канца XVI ст. У сваім лісце да папы рымскага Аляксандра VI ад 20 жніўня 1500 г. мітрапаліт прызнаў Фларэнтыйскую унію 1439 г., выказаў сваю пакору рымскаму першасвятару і прызнаў яго старшынство. Акрамя таго, Балгарынавіч загадаў перадаць папе рымскаму праз пасланніка Івана Сапегу, які вёз гэты ліст у Рым, умовы уніі, што ўключалі патрабаванні захавання грэчаскага абраду, прызнання сапраўднасці праваслаўнага хрышчэння, дазволу будаваць мураваныя цэрквы. Папа не адказаў мітрапаліту непасрэдна, але ў лістах у адказ да віленскага біскупа і да вялікага князя Аляксандра Казіміравіча закрануў пытанне уніі. У першую чаргу ён патрабаваў ад Іосіфа адмовы ад варожага да уніі канстанцінопальскага патрыярха Іаакіма, згодна з састаўленай граматай якога

Балгарынавіч быў узведзены на мітрапаліцкі пасад 10 мая 1500 г. Відавочна, у Аляксандра VI не было сапраўднага даверу да намераў ліцвінскага мітрапаліта. Праўда, за папскімі агаворкамі і пажаданнямі больш нічога не адбылося, бо Іосіф памёр у 1501 г. і ідэя царкоўнай уніі не атрымала далейшага развіцця. Пры гэтым можна канстатаваць, што, выступаючы хадайнікам царкоўнай уніі, ліцвінскі мітрапаліт не дзейнічаў па даручэнню праваслаўнай царквы ВКЛ, а хутчэй выконваў жаданне кіруючых колаў краіны, у першую чаргу самога вялікага князя літоўскага Аляксандра, якія ў тагачасных абставінах не маглі адкрыта выступаць яе прыхільнікамі, бо гэта было б на руку маскоўскай прапагандзе[11]. На тое, што гэта акцыя праходзіла са згоды вярхоў, указваюць і сучасныя даследчыкі[12]. Не маючы падтрымкі ні сярод католікаў, ні сярод праваслаўных, справа уніі была асуджана на няўдачу.

Як бачым, ужо ў канцы XV – пачатку XVI ст. кіраўніцтва ВКЛ добра ўсведамляла ўсю небяспечнасць для інтарэсаў краіны поліканфесійнага стану насельніцтва дзяржавы ва ўмовах, калі галоўны праціўнік разыгрываў на сваю карысць рэлігійную карту, пры гэтым удала выкарыстоўваў паводзінны стэрэатып «свой-чужы» і браў за яго аснову менавіта адрозненне ў веравызнанні. Выкліканая пагаршэннем знешнепалітычнага становішча дзяржавы спроба перахапіць у яго ініцыятыву шляхам увядзення ў княстве царкоўнай уніі і кансалідацыі на яе аснове грамадства краіны поспеху не мела. Але па меры таго, як з канца XV ст. усходні кірунак знешняй палітыкі ВКЛ стаў прыярытэтным, канцэнтруючы на сабе не толькі дыпламатычныя, ваенныя, але і ідэалагічныя сродкі яе ажыццяўлення, кіраўніцтву дзяржавы, выкарыстоўваючы прапагандысцкія прыёмы, удалося стварыць адмоўны вобраз «адзінавернай» Масковіі ў вачах праваслаўнай эліты ВКЛ, якая мела значны ўплыў у іншых пластах насельніцтва Вялікага княства Літоўскага, а таксама ў вачах еўрапейскай грамадскасці[13]. Першае адыгрывала асабліва вялікае значэнне, паколькі тым самым ствараліся ўмовы для ўнутрыпалітычнай стабілізацыі ў дзяржаве як апоры яе знешнепалітычных акцый. Да таго ж з гэтага часу ВКЛ пачало ўваходзіць у еўрапейскую палітычную сістэму каталіцкіх дзяржаў, шукала там саюзнікаў супраць Маскоўскай дзяржавы і іншых праціўнікаў, а пазней і жонак для сваіх вялікіх князёў, бо Аляксандр быў апошнім літоўскім вялікім князем, які ўзяў шлюб з праваслаўнай (дачкой маскоўскага вялікага князя Івана III Аленай). Апошняе сведчыла пра змены і ў дынастычнай палітыцы, бо калі раней вялікія князі літоўскія маглі, застаючыся ў лоне каталіцкай царквы, жаніцца з праваслаўнымі князёўнамі, то зараз такія шлюбы сталі немагчымымі, таму што Апостальскі пасад адмаўляўся прызнаваць іх законнымі[14]. Гэта прычынілася да таго, што ВКЛ канчаткова ўвайшло ў еўрапейскую каталіцкую дынастычную сістэму.

Такім чынам, са стратай ВКЛ дамінуючага становішча ў рэгіёне, адмаўленнем ад пашырэння сваіх тэрыторый далей на Усход і з пераходам да Маскоўскай дзяржавы ваенна-палітычнай ініцыятывы ўплыў праваслаўнага рэлігійнага фактару на знешнюю палітыку ВКЛ губляе былое значэнне і вызначальным становіцца ўплыў фактару каталіцкага. Праўда, на той перыяд яшчэ нельга казаць пра адпаведнасць канфесійных адрозненняў і знешнепалітычных кааліцый, якія пачынаюць наладжвацца ў гэты час як сродак дасягнення раўнавагі ў рэгіёне. Так, напрыклад, праваслаўная Маскоўская дзяржава ўваходзіла ў кааліцыі як з каталіцкімі краінамі (Святой Рымскай імперыяй германскай нацыі, Даніяй, дзяржавай Ордэна тэўтонаў і г. д.), так і з мусульманскім Крымскім ханствам, але ўсё ж адносна ВКЛ у агульных рысах можна казаць пра супадзенне рэлігійных і палітычных пераваг. Уваходжанне ж ВКЛ менавіта ў каталіцкія палітычную і дынастычную сістэмы таксама можна лічыць абумоўленым тым, што галоўным антаганістам княства ў рэгіёне была праваслаўная Маскоўская дзяржава. Сітуацыя некалькі змянілася толькі ў сярэдзіне XVI ст., калі палітычная эліта княства пачала вызнаваць пратэстантызм. Тады рэлігійны фактар прычыніўся да таго, што актывізавалася пранікненне ВКЛ у Лівонію. Ліцвінскую экспансію ў краіну, дзе пашыралася Рэфармацыя, ініцыіравала пратэстанцкая магнатэрыя княства.

[1] Гл.: Кананові ч У. І. Змаганне за спадчыну Рурыкавічаў // Беларуская мінуўшчына. 1997. № 5. С. 2–7.

[2] Ловмяньский Х. Русско-литовские отношения в XIV–XV вв. // Феодальная Россия во всемирно-историческом процессе: Сб. ст., посвящ. Л.В. Черепнину. М., 1972. С. 275; Памятники дипломатических сношений Московского государства с Польско-Литовским. Т. 1. 1487–1533 / Под ред. Г.Ф. Карпова // Сборник РИО. СПб., 1882. Т. 35. С. 460.

[3] Гл.: Памятники... С. 294–295.

[4] Гл.: Думин С. В. Другая Русь (Великое княжество Литовское и Русское) // История Отечества: люди, идеи, решения. Очерки истории России IX–XX вв. / Сост. С.В. Мироненко. М., 1991. С. 105–106.

[5] Гл.: Грушевський М. С. Історія України-Руси: В 7 т. Київ; Львів, 1907. Т. 4. С. 278; Думин С. В. Указ. тв. С. 105; Пресняков А. Е. Лекции по русской истории. М., 1939. Т. 2. Вып. 1. С. 167; Błaszczyk G. Litwa na przełome średniowiecza i nowozytności: 1492–1569. Poznań, 2002. S. 27; Jablonowski H. Westrussland zwischen Wilna und Moskau. Die politische Stellung und die politischen Tendencen der russischen Bevölkerung des Grossfürstentums Litauen im 15. Jh. // Studien zur Geschichte Ost Europas. Leiden, 1955. S. 128–132; Kolankowski L. Polska Jagiellonów. Dzieje polityczne. Lwów, 1936. S. 172.

[6] Гл.: Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі. КМФ-18. Воп. 1. Спр. 5. Арк. 103–104.

[7] Гл.: Jablonowski H. Ibid. C. 54.

[8] Гл.: Гісторыя Беларусі ў дакументах і матэрыялах: У 4 т. Менск, 1936. Т. 1. С. 213–214; Малиновский И. А. Рада Великого Княжества Литовского в связи с Боярской думой древней России: В 2 ч. Томск, 1912. Ч. 2. Вып. 2. С. 56–61.

[9] Гл.: Памятники… С. 457.

[10] «Выписка из посольских книг» о сношениях Российского государства с Польско-Литовским за 1487–1572 гг. // Памятники истории Восточной Европы. Источники XV–XVII вв. М.; Варшава, 1997. Т. 2. С. 99.

[11] Гл.: Базилевич К. В. Внешняя политика Русского централизованного государства: Вторая половина XV века. М., 1952. С. 437–438.

[12] Гл.: Гиркontас Р. Попытки церковной унии в Великом Княжестве Литовском в XV в. // Славяне и их соседи. Ка-

толицизм и православие в средние века: Сб. тез. М., 1991. С. 30–32; Кром М.М. Меж Русью и Литвой: западнорусские земли в системе русско-литовских отношений конца XV – первой трети XVI в. М., 1995. С. 94; Pietkiewicz K. Wielkie Księstwo Litewskie pod rządami Aleksandra Jagiellonczyka. Studia nad dziejami państwa i spoleczeństwa na przełomie XV i XVI wieku. Poznań, 1995. S. 167–169.

[13] Гл.: Мікалаева Л.В. Вобраз «чужога» ў дыпламатычнай дакументацыі Вялікага княства Літоўскага канца XV – першай чвэрці XVI ст. і адбіццё ў ім прапагандысцкіх элементаў знешняй палітыкі дзяржавы // Приоритеты интеллектуальной элиты в развитии мировой цивилизации: Материалы Междунар. науч.-теорет. конф., Минск, нояб. 2002 г. Мн., 2002. С. 309–311; Флоря Б.Н. Древнерусские традиции и борьба восточнославянских народов за воссоединение // Пашуто В.Т., Флоря Б.Н., Хорошкевич А.Л. Древнерусское наследие и исторические судьбы восточного славянства. М., 1982. С. 175.

[14] Гл.: Пирлинг О. Россия и папский престол / Пер. с фр. В.П. Потемкина. М., 1912. Кн. 1. С. 282, 286.

Паступіў у рэдакцыю 20.09.07.

***Людміла Віктараўна Мікалаева*** – кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры гуманітарных дысцыплін БДУІР.